**ПАДЗЕЯ**

## Сёння адкрываецца XXIV Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш. Чым здзівяць чытачоў?







Фота Паўла ЧУЙКО

На выставе адлюстраваны такія тэмы, як 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, 135-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

# ЖЫЦЦЁ ЯК РАСКРЫТАЯ КНІГА

Некалькі гадоў таму выстава пераехала з маленькага павільёна на праспект Пераможцаў у большы па плошчы будынак, які ў народзе называюць «рамонкам». Гэта як пацвярджэнне таго, што кніга, нягледзячы на сучасныя тэхналогіі, жыве і па-ранейшаму прыцягвае да сябе шмат увагі. Гэтак адбываецца ўжо пяць стагоддзяў. Менавіта юбілей кнігадрукавання і стане сёлета галоўнай тэмай свята. Арганізатары штогод рыхтуюць шмат цікавых сустрэч і сюрпрызаў, будуць яны і зараз.

*Працяг на стар. 3*




Выставачны павільён на праспекце Пераможцаў у чаканні кнігалюбаў.

# ЖЫЦЦЁ ЯК РАСКРЫТАЯ КНІГА

**Падчас выставы пройдзе каля 300 мерапрыемстваў. У прыватнасці, будуць адлюстраваны такія тэмы, як 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, 135-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа**

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)*

Ушаноўваць справу Скарыны з'ехаліся прадстаўнікі 31 краіны. Гэта не толькі нашы бліжэйшыя суседзі, але і госці з далёкага Эквадора, Венесуэлы, Кітая, Ірана, Сірыі і г.д. Дарэчы, яны не навічкі на гэтым свяце: ледзь не кожны год знаёмяць нас са сваёй спадчынай і сучаснымі выданнямі. А вось Грэцыя ўпершыню размесціць свае паліцы на мінскай выставе. Стэнд у Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі сёлета будзе асабліва адметным. Услед за Расіяй, Германіяй, Кітаем, Іранам і ЗША яно атрымала права стаць ганаровым госцем.

Не толькі брытанцы, але і іншыя экспаненты падрыхтавалі шмат цікавых конкурсаў, сустрэч. Першы намеснік міністра інфармацыі Ігар Луцкі расказаў, што падчас выставы пройдзе каля 300 мерапрыемстваў: «У іх знойдуць сваё адлюстраванне такія тэмы, як 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, 135-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, юбілейныя даты Пімена Панчанкі, Янкі Брыля і іншых пісьменнікаў». Дарэчы, ужо традыцыйны міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час» сёлета таксама пройдзе пад знакам 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Спіс яго ўдзельнікаў сёлета будзе як ніколі гучным. Гэта і аўтар трылераў нумар адзін у Італіі, тэлевядучы і сцэнарыст Карла Лукарэлі, і вядомы брытанскі публіцыст і шэкспіразнаўца Эндру Дыксан, і папулярны дзіцячы фінскі пісьменнік Ціма Парвела, і іншыя. Усяго прадстаўнікі дзевятнаццаці краін.


Свае выданні прадставяць больш за 30 краін.
Фота Паўла ЧУЙКО

Сімпозіум адбудзецца ў Нацыянальнай бібліятэцы. Усяго ж будзе задзейнічана пяць пляцовак, але асноўныя мерапрыемствы пройдуць на праспекце Пераможцаў, 14. Дзяржаўныя і прыватныя выдавецтвы, вядома ж, найперш будуць заклікаць да сябе сваімі навінкамі. Але кожны экспанент да дробязей прадумаў арыгінальныя забаўляльныя праграмы, каб звярнуць увагу менавіта на сябе. Напрыклад, на стэндзе Швецыі будзе праходзіць конкурс на лепшае сэлфі, «Пачатковая школа» збіраецца праводзіць навуковыя вопыты, пасольства Ізраіля арганізуе творчую майстэрню, а там квілінг, напісанне літар іўрыта і іншае. Словам, на выставу можна ісці не толькі за ведамі, але і за настроем.

Вядома, кожны там знойдзе выданне на свой густ. Але асабліва раім звярнуць увагу на творы пераможцаў 56-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Іх прозвішчы будуць абвешчаны 10 лютага.

**Наталля СЦЯПУРА**
stepuro@sb.by